


# УСЁ ЛЕПШАЕ — НА ВЫСТАЎКУ!




**6 чэрвеня ў рамках Беларускага аграпрамысловага тыдня на дэманстрацыйнай пляцоўцы ААТ «Гастэлаўскае» (Мінскі раён) адкрылася 22-я Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра — 2012». Арганізатары выставы — ЗАТ «Мінскэкспа» пры падтрымцы і непасрэдным удзеле Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства прамысловасці і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Сучасны аграрны бізнэс немагчыма ўявіць без падобных выстаў, бо яны дазваляюць убачыць і абагульніць сусветны вопыт у аграпрамысловым машынабудаванні, вызначыць найбольш перспектыўныя кірункі развіцця індустрыі.

На выставе «Белагра — 2012» прадстаўлены дасягненні сучаснай селекцыі сельскагаспадарчых культур, племянной жывёлагадоўлі, племянная і спартыўная конегадоўля, арганізаваны паказ працы тэхнікі ў полі.

Свае апошнія распрацоўкі дэманструюць навукова-практычныя цэнтры НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі, земляробстве, харчаванні, бульбаводстве і пладаагародніцтве. Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі і ГА «Белплемжыўаб'яднанне» арганізавалі спецыяльную экспазіцыю дасягненняў айчыннай жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі.

**Удзельнікамі «Белагра — 2012» сталі больш за 300 кампаній з 18 краін: Беларусі, Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Ірана, Іспаніі, Кітая, Рэспублікі Карэі, Латвіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі. Каля 70% экспанентаў прадставілі беларускія ўдзельнікі выставы.**

— Гэта лепшыя прадстаўнікі нашага селекцыйна-племяннога завода «Нуклеус» — свінаматкі з парасятамі нашай айчыннай пароды Ландрас, — з гонарам дэманструе **першы намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі, акадэмік, доктар сельскагаспадарчых навук Іван ШАЙКО**. — Мы на «Нуклеусе» ствараем уласны племянны фонд свіней (фота 1). І хачу сказаць, што ў найбліжэйшай будучыні — на працягу 5, максімум 10 гадоў — беларуская свінагадоўля пяройдзе менавіта на такія генатыпы. Яны больш патрабавальныя, але затое змяшчаюць больш мяса ў тушы. У свінаматак вельмі добрыя такія якасці, як шматплоддзе, малочнасць, добрая захаванасць парасят. Мы рэкамендуем выкарыстоўваць менавіта гэтую пароду, разам з пародай Ёркшыр, для вырошчвання на прамысловай аснове.


1


2

Паглядзіце, які ў яго экстэр'ер! — адкрыта любуецца сваім гадаванцам **загадчык лабараторыі конегадоўлі і авечкагадоўлі НПЦ па жывёлагадоўлі Юрый ГЕРМАН**. — Гэта жарабец беларускай запражной пароды, якая выводзілася на працягу 30 гадоў і была зацверджана ў 2000 годзе (фота 2). Гэта наш беларускі брэнд, на сённяшні дзень самая маладая парода ва ўсім свеце.

Адметная яе асаблівасць у тым, што яна з'яўляецца ўніверсальнай. Як кажуць, «і пад ваду, і пад ваяводу». На ёй можна араць на прысядзібных участках. Акрамя таго, яна ахоўвае мяжу, яе выкарыстоўваюць у пагранатрадах. Яна вельмі непераборлівая, цягавітая, устойлівая да камара і машкары. А ў будучыні мы збіраемся стварыць беларускі цяжкавозны тып — добрую мясную пароду.

Ва ўсёй разнастайнасці прадстаўлена на выставе сельскагаспадарчая тэхніка.

Вось ўніверсальны энергетычны сродак «Раса» на шынах-абалонках нізкага ціску (фота 3). — Модулем на яго можна наважваць раскідвальнік мінеральных угнаенняў або распырсквальнік пестыцыдаў, — распавядае **Валерый ОЖЫЧ, інжынер па эксплуатацыі ТАА «Аграмашрэсурса» (вёска Новый двор Мінскага р-на)**. Дзякуючы шынам стварaецца звышнізкі ціск на глебу, што дазваляе выкарыстоўваць гэты агрэгат на пераўвільготненых глебах і на палях з усходамі. Пры гэтым тэхналагічнай каляіны не ўтворыцца, а праз пару дзён будзе нават не відаць, дзе праходзіла машына.

— Гэты матаблок прызначаны для выканання ўсіх аперацый па апрацоўцы глебы, пасеву, міжраднай апрацоўкі. Можа выкарыстоўвацца на невялікіх участках, бо валодае добрай манеўранасцю. Купляюць яго ў асноўным фермеры, дачнікі, — гаворыць **начальнік канструктарскага бюро ўпраўлення канструктарска-эксперыментальных работ Мінскага трактарнага завода Васіль ГНЕДЧЫК**. — Наша міні-тэхніка вырабляецца ўжо даўно, яна прыйшла на змену коням пасля таго, як скарацілася іх пагалоўе. А вырабляе яе наш філіял, Смаргонскі агрэгатны завод. Каштуе ў залежнасці ад камплектацыі ад 16 да 19 млн беларускіх рублёў.

Сярод іншых беларускіх удзельнікаў выставы — вытворцы сельгастэхнікі: «БелГазАўтасэрвіс» «Дарэлектрамаш», «Гомсельмаш», «Дармашэкспа», прадпрыемствы РА «Белаграсэрвіс», «Полымя», «Агратранзіт», «Профі — Аграпарк», «Белросаграсэрвіс», «Белшынтагсэрвіс», «Росінтэхгруп», «Брэстсельмаш», «Ферабокс», «МАЗ-МАН», «Тэхпрамдыск», «СелАгра», «Стары Млын». Імпарцёры: «Агротыка», «Белросаграсэрвіс», «Пазадарожнік», «СВ Машыны», «Профі-Аграпарк». Яны дэманструюць сучасную сельгастэхніку рознага прызначэння: пазадарожнікі, аўтакраны, экскаватары, пагрузчыкі, краны. Характэрна таксама, што айчынная сельскагаспадарчая прадукцыя, машыны, абсталяванне дэманструюцца ў тэхналагічным ланцужку з сучаснымі энергазберагальнымі тэхналогіямі ўсіх галін, звязанымі як з вытворчасцю сельгаспрадукцыі, так і з яе перапрацоўкай, транспарціроўкай, захоўваннем і рэалізацыяй на ўнутраным і знешнім рынках.

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

